Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ГОЛАС ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 9 Вільня, Субота 12-га трауня 1928 г. Год 1

Па загаду Гродзкага Старосты места Вільні скафіскаваны № 8 газ. „Голас Працы“ за перадавіцу „Грамада“, за стацьцю „1-га мая ў Вільні“ і заметку „Арышты ў Львове“.

Чорныя сілы.

Напад на радавага торговага прадстаўніка ў Варшаве Лізарова зноў выносіць на сьвет справу, над якою ўжо ня раз прымушаны спыніцца кожны работнік і селянін Польшчы, у асаблівасьці-ж беларускія сяляне і работнікі.

Ня так, здаецца, даўно ўсё мы былі сьведкамі забойства радавага прадстаўніка Войкава праз „знамянітага“ цяпер Кавэрду, усьлед затым бачым пакушэнь-Трайковіча, у апошніх днях арыштавана ў будынку таго-ж радавага прадстаўніцтва „вар‘ятка“ Валентыновічанка, нарэшце напад Войцэховскага.

Мы ня будзем уваходзіць у разбор той міжнароднай комплікацыі, якая вытвараецца ў зьвязку з гэтымі проста сыстэматычнымі нападамі, скірованымі на адзін і той самы пункт і выходзячымі з аднаго і таго-ж самага асяродку. Для нас важна справа перадусім беларускіх сялян і работнікаў тут, у Заходняй Беларусі, справа наагул працоўных гушчаў, якія ў зьвязку з вышэйшымі падзеямі стаяць перад страшэннай небясьпекай, пагражаючай іх супакою і мірнаму разьвіцьцю.

Усім, хто чытае газэты, добра ведама, што асяродкам, які зьяўляецца пастаўшчыкам пералічаных вышэй „героя“—зьяўляецца, скажам проста, банда расейскіх манархістаў, ці то эмігрантаў, ці то навет грамадзян Польшчы, якія, будучы рэвалюцыяй выкінутыя з жыцьця і, заместа таго, каб быць губэрнатарамі, судзьдзямі, генэраламі і г. д.—прымушаны цяпер замятаць чужыя надворкі, або абіваць парогі тых, каго калісьці яны лічылі падуладнымі. Апынуўшыся на сьметніках жыцьця, яны бязумоўна ня могуць забыцца на той, ужо далёкі цяпер час, калі яны былі панамі ўсяго. Паварот свайго залатога часу яны паставілі мэтай свайго існаваньня. Будучы расселены па ўсей Зах. Эўропе і злучаныя ў цэлае строгай дысцыплінай, маючы бязумоўна ўва ўсім буржуазным сьвеце паддзержку з боку рэакцыйных колаў—у вапошнія гады расейскія манархісты робяцца ўсё што раз актыўнейшымі.

Ня так ужо даўно зьявіўшаеся ў друку пісьмо войта Палачанскай воласьці, М. Пятровіча, які перад гэтым варыўся ў іх самым соку, раскрывае з усей аголенасьцю іх цяперашнюю ролю і імкненьні, паказваючы адначасна, што яны выступаюць навет як беларуская палітычная партыя з цэлым радам паралельных арганізацыяў — шопак (Паўлюкевічаўшчына) і што гэтыя легальныя арганізацыі, прытым „полёнофільскія“, зьяўляліся запраўдным гняздом усяе шайкі ў Польшчы. Прыпомнім, што першыя тры „героі“ — Кавэрда, Трайковіч, і Валентыновічанка выехалі „бяз гроша ў кішані, на свой страх і рызыку“ іменна з Вільні. Падкрэсьлім словы М. Пятровіча, што мэтай банды зьяўлялася *праваканьне адносінаў між Польшчай і СССР* і гэта бязумоўна так, бо на гэта паказваюць факты, якія сыстэматычна паўтараліся ў адным і тым-жа кірунку і аб гэтым сцьвярджаюць зьмешчаныя сягоньня ноты Багамолава і Чычэрына.

Такім чынам, чорная сотня зьяўляецца запраўды гняздом бандытаў, якія ставяць перад працоўнымі Польшчы *здань вайны*, якую будуць прымушаны вынесьці на сваіх сьпінах працоўныя гушчы, а беларускія працоўныя да таго-ж будуць змушаны перажываць увесь жах вайны, які бязумоўна-ж адбудзецца на іх палетках.

Мы ня можам моўчкі праходзіць міма тых фактаў, што ў той час, калі, як піша „Kurjer Wileński“, на лаве абвінавачаных сядзіць увесь беларускі народ, у Польшчы свабодна разгульваюць ў плашчы палянафілаў Паўлюкевічаўцы, разьвіваецца „лёяльная“ прэса, як беларуская, гэтак і расейская, калі існуець запраўды „сьпісак замахоўцаў“ на супакой і цэласьць навет тае самае Польшчы, за цэласьць якое, як гаворыцца афіцыяльна, сядзіць на лавах абвінавачаных „увесь беларускі народ“.

Беларускія працоўныя гушчы пільна сачаць за ўсею акцыяй манархістычнае чорнае банды і ў абліччу працэсу Грамады трэбуюць урэшце зьнішчыць гэтае гняздо, якое запраўды зьяўляецца небясьпекай ня толькі для працоўных гушчаў, але і самае дзяржавы. Апрача таго, верачы ў свае ўласныя сілы, перад тварам небясьпекі — беларускія працоўныя гушчы яшчэ шчыльней самкнуць свае рады, яшчэ мацней праймуцца думкай, што толькі ў еднасьці ўсіх працоўных — іх сіла і ратунак.

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

35 дзень працэсу Грамады 18/IV 1928 г.

У далейшым цягу выступаюць сьведкі са стараны абвінавачаных Рак-Міхайлоўскага, Мятлы, Астроўскага і Луцкевіча.

Сьв. А. Тамашэўская з боку абв. Шнаркевіча бачыла яго ад рана і да вечара заўсёды ў канцэлярыі за працай (Вялікая вул. Цэнтр. Сэкр. Гр.). Сабраньняў у яго ніколі ня было.

Сьв. А. Ходзька—служачая Р.-Міхайлоўскага сцьвярджае, што пасол у часе сваей хваробы ў сакавіку 1926 г. нікуды не выяжджаў са сваей кватэры ў Вільні (Вастрабрамская 7). Таксама і да хворага, апрача мацеры з вёскі, ніхто не прыяжджаў. Р.-Міхайлоўскі жыў вельмі скромна і ніколі не пазваляў сабе непатрэбных грашавых выдаткаў.

Сьв. Я. Капуста сял. Язьненскае вол. прыходзіў у дню 29. XII. 26 г. да Мятлы, які ў той час знаходзіўся дома, у в. Кухцінцы і нідзе не выяжджаў. Іншыя сябры аднасілі Мятле ў гэты дзень сяброўскія складкі. Ніякіх прамоваў Мятла ня меў. Сьведка таксама ня чуў, каб з білетам Грамады прыймалі заграніцай. Абв. Мятла — ці сьведка выпісваў газэту і ці плаціў за яе грошы?

Сьв.—выпісваў і плаціў.

Сьв. Ганебны — з боку абв. Мятлы прыяжджаў да яго таксама 29. XII з в. Касабук і купіў у б. пасла белар. каляндар. Мятла казаў, што можна дамагацца беларускае школы, але дзеля гэтага трэба сабраць адпаведны лік падпісаў, якія мусяць быць пасьведчаны войтам. Ніякіх гутарак аб тым, каб не плаціць падаткаў, ня было; ня было таксама апору проці камасацыі (пераходу на хутары).

Сьв. Краська А.—з боку абв. Мятлы, таксама, як і папярэднія сьведкі, прыяжджаў да пасла ў дню 29. XII. 26 г. Купіў каляндар і прасіў выясьненьня, як трэба складаць дэкларацыі на бел. школу. На хутары сяляне ішлі і ідуць ахвотна. Сябры гурткоў плацілі па 1 злотаму ў месяц.

Сьв. Маслоўскі Я.— з в. Плігавак, прыяжджаў да Мятлы на чацьверты дзень Каляд і даручыў яму ў гэты-ж дзень 18 зл., сабраных сялянамі на будоўлю беларускае гімназіі ў Глыбокім. Гурток у іх вёсцы выпісваў газэту, за якую акуратна плаціў падпісныя грошы. Падчас ліквідацыі камэндант пал. забраў разам з іншымі паперамі і сабраныя складкі, дзеля чаго выйшла затрыманьне з высылкай грошы ў рэдакцыю.

Прак. Раўзэ — ці казаў Мятла, што сяброўская легітымацыя зьяўляецца адначасна і пропускам у Расею? **Сьв.**—не, не казаў.

Мятла—а што я казаў па поваду ўцечкі ў Расею аднаго селяніна, які пабаяўся месячнага арышту ў Польшчы? **Сьв.**—вы казалі, што ён дрэнна зрабіў, што ўцёк.

Сьв. Самайловіч, ксёндз, знае абв. Каўша ад пачатку 1920 г., калі абодвы былі ў Майкопе. Коўш ніколі ня быў ані камісарам, ані камуністым. Быў навет за нешта, арыштаваны бальшавікамі і прасядзеў у турме два месяцы. Выехаў з Расеі дзеля таго, што яму не падабаўся бальшавіцкі рэжым.

Хамінскі.—б. пасол на Сойм, ад Вызваленьня-сьведка з' боку абв. Тарашкевіча. Запазнаўся з ім 20 гадоў назад, калі абодвы былі вучнямі аднае гімназіі. З палітычнай дзеяльнасьцю Тарашкевіча спаткаўся ў часе, як тварыўся ўрад „Litwy Srodkowej“ (гэн. Жэлігоўскага). Сьведка называе гэты час шчасьлівым, бо тады яшчэ ўсе меншасьці арыентаваліся на Польшчу і спадзяваліся што Польшча здаволіць іх мінімальныя жаданьні. На гэтым-жа груньце стаяў і абв. пасол Тарашкевіч, які таксама імкнуўся да палепшаньня долі свайго народу ў рамах польскае дзяржаўнасьці. Тарашкевіч у той час асабліва інтарэсаваўся белар. школьніцтвам. Добрыя адносіны паміж нац. меншасьцямі і польскімі левымі партыямі не папсаваліся навет і ў 1922 г., падчас выбараў у Сойм. У першай-жа сваей соймавай прамове Тарашкевіч падкрэсьліў, што Бел. Пас. Клюб прадстаўляець у Сойме беларускі народ у Польшчы. Праграмы Бел. Пас. Клюбу і Вызваленьня амаль што ня розьніліся. За найгалаўнейшую розьніцу сьведка лічыць тое, што Бел. Пас. Клюб стаяў на груньце народным, Вызваленьне-ж — клясовым. Спачатку, пакуль яшчэ беларускіе паслы ня страцілі веры ў Польшчу, яны ўсе стаялі па груньце глыбока дзяржаўным. Сьведчыць аб гэтым некалькі фактаў як напр. — той, што Бел. Пас. Клюб падтрымаў урад Сікорскага, які многа чаго абяцаў беларусам. Сталася, аднак-жа, усё наадварот і дзеля таго, што польскія ўрады абяцалі многа, але не патрымалі нічога, Тарашкевіч, як і ўсе іншыя беларускія паслы, што раз то больш губляў надзею ў польскія вярхі. Ніколі ня зрываючы з польскай дзяржаўнасьцю, Тарашкевіч, па страце надзеі, атрымаць штось зьверху пачаў імкнуцца, у рамах гэтае-ж дзяржаўнасьці, шляхам арганізацыі, шляхам самапомачы, дабіцца зьдзейсьненьня жаданьняў беларускага народу. Дзеля гэтае мэты і была аснована ўлетку 1926 г. палітычная партыя—Грамада, першым заданьнем якой было дабіцца беларускіх школаў, якія польскі ўрад зусім дашчэнты зьнішчыў. Абсалюнае няверы ў польскія ўрады ўсё-ж такі і ў часе існаваньня Грамады ня было. Відаць гэта з прамоваў Тарашкевіча ў Сойме, якія мелі ўсьцяж характар даволі лагодны.

Адв. Бабянскі — якое ўражаньне рабіў Тарашкевіч, як чалавек і палітык? **Сьв.**—Тарашкевіч ніколі не працаваў для ўласнае карысьці. Ен перадусім беларускі патрыёт і ідэёвец бязумоўна чысты. **Адв. Гонігвіль**—калі зьявіліся чуткі аб ліквідацыі Грамады? **Сьв.**—ў верасьні 1926 г. Памятую, Тарашкевіч, больш-менш у гэтым часе бараніў з соймавай трыбуны сваю арганізацыю ад несправядлівых закідаў, робленых ей польскай прэсай. **Прак. Раўзэ**—як пагадзіць імкненьне Бел. Пас. Клюбу адначасна да поўнае незалежнасьці і аўтаноміі ў рамах польскае дзяржаўнасьці? **Сьв.** — я лічу, што кожны чэсны беларус, які хоча, каб яму падавалі руку, павінен жывіць у сваей душы думку аб незалежнай Беларусі. Усе беларускія палітычныя партыі, за выняткам хіба што аднаго Паўлюкевіча, стаяць на гэтым становішчы. Думка аб незалежнай Беларусі—гэта лятуценьне, ідэал кожнага чэснага беларуса ў сучасных абставінах. Не пакідаючы гэтае думкі, кожны белар. палітык, прытарноўваючыся да канкрэтных абставінаў, можа, зразумела, дамагацца аўтаноміі для часткі сваей бацькаўшчыны, знаходзячайся напр. пад Польшчай.

Адв. Пятрусэвіч—ці пан знае абв. Луцкевіча? **Сьв.**—Так, знаю яго, як культурнага дзеяча на ніве беларускага адраджэньня.

Адв. Пятрусэвіч: якія адносіны былі паміж Луцкевічам, а нямецкімі акупантамі? **Сьв.**—Луцкевіч выдаваў за нямецкія грошы бел. газэту „Homan“, як гэта з рэштай рабілі і палякі ў той час. Ня будучы бязумоўна ніколі нямецкім агэнтам, імкнуўся да зьдзейсьненьня за нямецкія грошы народных мэтаў.

Сьв. Скірмунт Р.—б. старшыня міністраў Бел. Народнае Рэспублікі знае абв. Аўстроўскага ад 1916 г. Астроўскі ў 1917 г. быў камісарам тымчасовага ўраду Керэнскага. Пасьля кастрычнікавай рэвалюцыі ўцёк да Дэнікіна. Быў чалавекам заможным і ніякіх сымпатыяў да камуністаў ня меў.

Сьведкі Піліхоўскі, Уладзіміраў, Зеванчык і Навіцкі знаюць абв. Стоціка і Сакалоўскага, як парадачных і рэлігійных людзей. У доме Сакалоўскага часта адбываліся тэатральныя рэпэтыцыі, якімі кіраваў Уладзіміраў, (сьведкі абвінавачаньня закідываюць, што ў Сакалоўскага адбываліся нелегальныя сабраньні).

Сьв. Скурка Васіль—пал. вязень, быў кіраўніком каапэратыву „Сноп“ ў Глыбокім. На ўрачыстасьці каапэратыву (6. VI. 26 г.) Стоцік ніякае прамовы ня меў. **Абв. Мятла**, ці сьведцы ведама чаму, Віленскае Куратарыум не пазволіла адчыніць белар. школу ў Глыбокім? Сьв.—Таму, што была польская.

Сьв. Краўчонак Тодар—знае абв. Шэвеля і ніколі ня бачыў у яго ніякага аружжа. Шэвель быў солтысам „obwodowym“, казаў, што падаткі плаціць трэба. Аб ніякай рэвалюцыі нічога не казаў.

Сьв. Шмацюк—сцьвярджае, што абв. Патоцкі ні на якім сабраньні нічога „wywrotowego“ не казаў.

Сьв. Мяленя Мік. — з боку абв. Кузьміча сцьвярджае, што паміж Кузьмічом а абшарнікам Пашкоўскім і асаднікам Фэцькам (сьведкамі з боку абвінавачаньня) была судовая справа. Абодва грazілі Кузьмічу, што запакуюць яго на 10 гадоў у турму, калі ён рашыцца з імі судзіцца.

Адв. Дурач—просіць Суд паклікаць сьведак з боку абв. Кляўдыі Гоцко, якія маюць сцьвярдзіць, што абв. К. Гоцко ня прыймала ўчасьця ў маніфэстацыі 6. X. 26 г. ў Карэлічах (у чым яе галоўным чынам абвіняюць). Сьведак гэтых Суд, дзеля прычын формальных, не паклікаў зусім. Адв. Дурач пазываецца на вырак Найвышэйшага Суду ў Варшаве і на ўсе эўрапэйскія законы, якія падкрэсьліваюць, што прычыны фармальныя мусяць уступіць там, дзе ходзіць аб найважнейшую квэстыю для абвінавачанага.

Суд нараджаецца і па нарадзэ адкідае просьбу адв. Дурача.

Сьв. паны Мысьлівец, Касьценчык і Ігнатовіч—з боку абвінав. Нікіфароўскага, Каўша і Сакалоўскага сцьвярджаюць, што яны былі людзьмі рэлігійнымі і парадачнымі. Нікіфароўскі быў навет перасьледаваны праз бальшавікоў, дзеля таго, што будучы афіцэрам, не пайшоў на бальшавіцкую службу.

Сьв. Сьвяневіч Ст., асыст. Віл. Унів., сьведка з боку абв. А. Луцкевіча. Знае Луцкевіча, як белар. культурна нацыянальнага дзеяча, які імкнуўся да паразуменьня з Польшчай. Сьведка памятуе, як Луцкевіч адраджываў беларускім матурыстам ехаць у Менск, а лепш ў Прагу. **Адв. Эттінгэр** — ці сьведка чуў аб існаваньні Бел. Сац. Грамады 1905 г.? Сьв.—Чуў. **Эттінгэр** — ці Бел. Сял. Раб. Грамада не зьяўлялася далейшым працягам Бел. Сацыял. Грамады? **Старшыня Суду Аўсянка** — сьведка ня ёсьць экспэртам, адхіляю гэтае пытаньне. **Адв. Эттінгэр**—у гэтакіх абставінах я не магу ставіць пытаньняў. Прашу толькі запратакалаваць мае адхіленае пытаньне. **Адв. праф. Пятрусэвіч** — ці сьведка знае Астроўскага? Сьв. — знаю. У прыватных гутарках Астроўскі казаў, што, хоць ён і не зьяўляецца сымпатыкам Грамады, але лічыць, што гэткая арганізацыя, як Грамада, вельмі патрэбна для доказу Палякам, што народ беларускі існуе. **Пракур. Раўзэ**—ці пан чуў якую характарыстыку аб Луцкевічу выдаў Чарвякоў (Стар. Нар. Каміс. Бел. Сац. Сав. Рэспубл.). **Сьв.**—Не. **Пракур. Раўзэ**—а аб супольнай працы Луцкевіча, Астроўскага і Уласава, пад загалоўкам „Белы тэрор ў Польшчы“—выданнай ў Менску? Сьв.—Не. **Абв. Луцкевіч** асьвядчаю Суду, што аб гэтай працы я чую сяньня першы раз ад пана пракурора.

Сьв. Выслаух Сэв.—асыст. Віл. Унів., пазнаёміўся з Луцкевічам яшчэ перад вайной. Увесь час Луцкевіч займаўся культуральнай працай. Да Грамады не належаў. Ніколі не адмаўляўся ад супрацоўніцтва з польскай

дэмакратыяй. Сьведчыць аб гэтым хоць бы той факт, што калі ўжо іншыя беларускія дзеячы згубілі веру ў польскія ўрады, Луцкевіч не адмовіўся ўступіць у Т-ва „Пагоня“ і супрацоўнічаў з Палякамі ў галіне пазнаньня роднага краю. **Адв. Пятрусэвіч** — ці пан знае Астроўскага? **Сьв.**—знаю. Падчас апошніх выбараў прозьвішча Астроўскага фігуравала на сьпіску № 41, які стаяў на груньце выразна народна беларускім у рамах польскае дзяржаўнасьці.

Сьв. Уладз. Гатмэ — баптыста пацьвярджае, што Луцкевіч пераклаў на беларускую мову тры эвангэліі.

Сьв. Чатырка, вуч. бел. гімназіі ў Наваградку, знае Астроўскага, як старшыню Т-ва Бел. Школы. Т-ва імкнулася да працы культуральна-асьветовае. Абв. Шнаркевіч таксама займаўся працай выключна культурнай.

Абв. Анічыц — сьведка быў на зьездзе, скліканым Паўлюкевічам у 1926 г. Можа сьведка вызсьніць, чаму перарваліся абрады камісіі палітычнае? **Сьв.**—абрады скончыліся нічым таму, што зьявіўся п'яны Падбярэскі і пачаў калатню з Шышкавым. Рэзалюцыі навет ня былі дзеля гэтае прычыны прыняты ў камісіі. (Анічыц абвіняецца, быццам перашкодзіў прыняцьцю гэтае рэзалюцыі).

Сьв. Кэпэль—пацьвярджае, што ў жніўні 1925 г. Астроўскі нікуды не выяжджаў з Вільні дзеля таго, што мусіў даглядаць за рамонтам, які адбываўся ў той час у памешканьні гімназіі.

Сьв. Міхалевіч Алякс. — вучыц. бэл. гімназіі ў Вільні, пацьвярджае тое самае. Па-за гэтым дадае, што Астроўскі вельмі клапаціўся аб добрае выхаваньне вучнёўскае моладзі. Перакананьняў камуністычных ніколі ня меў.

Сьв. Якубёнак—дыр. бел. гімн. ў Клецку, знае абв. Шнаркевіча ад 1922 г., які выключна аддаваўся працы асьветовай. Шнаркевіч выехаў з Расеі дзеля таго, што ня вытрымаў тамашняга рэжыму. Добра характарызуе распачлівы стан беларускіх гімназіяў у Клецку і Нясьвежы ў пачатку іх існаваньні пад Польшчай. Вучыцялі спалі ў клясах на саломе і самі замяталі клясы. Ня было ані часу, ані настрою вясьці якія небудзь палітычныя размовы. **Адв. Пятрусэвіч**—як абходзілі бел. гімназіі польскія нар. сьвяты? **Сьв.**—Дзеля гэтага выбіраўся спэцыяльны камітэт, які і займаўся гэтай справай, падгатаўляючы малебен і г. д.

Сьв. А. Баран—з боку абв. Р.-Міхайлоўскага. Належаў да гуртка ў в. Максімаўцы і быў на сабраньні ў верасьні 1926 г. Прысутных было 19 асоб. Рак-Міхайлоўскі чытаў праграму Бел. Сял.-Раб. Грамады. Ніякае кабеты на сабраньні ня было. Малютка таксама ня быў, бо яго ў гурток ня прынялі дзеля таго, што ён напʻецца гарэлкі, выйме рэвальвэр і крычыць: „moj rząd“ (Малютка—сьведка з боку пракуратуры). Усе сябры плацілі складкі, частка якіх адсылалася ў Цэнтр. Сэкр. ў Вільню. Гурток выпісваў бел. газэты.

Сьв. Міх. Баран—пацьвярджае тое самае, што казаў папярэдні сьведка і на пытаньні абароны, адказвае, што вёска Максімаўка акуратна плаціла падаткі і што ніякіх фразаў, як „біць паноў“, „рабіце паўстаньне, а аружжа будзе“—ён ад Рак-Міхайлоўскага ня чуў.

Сьв. Гаўрылік, пасол на Сойм, знае Бурсэвіча, які быў вучыцелем у прыватнай бел. школе ў Чамярах. Прапанавалі яму польскую школу, але ён адмовіўся. Перад паўстаньнем Грамады Бурсэвіч быў місіянэрам-мэтадыстым. Школа, у якой вучыў Бурсэвіч, утрымлівалася з помачы сялян і запамог Т-ва Бел. Школы. **Адв. Прайс** — ці сьведцы вядомы гэтыя прозьвішчы, як Шарамэт, Шайга, Талстоў.

Сьв.—Шарамэт і Шайга былі вучнямі Радашкаўскае гімназіі, але з 6 кл. былі выгнаны. Трэцяе-ж прозьвішча мне зусім невядома. (Рэд.—гэта тыя „матурысты“, якія быццам з пропускам ад Астроўскага перайшлі заграніцу).

Часовае залагоджваньне канфлікту між Англіяй і Эгіптам.

Пад пагрозай новага бамбардаваньня эгіпецкіх партоў англійскім флётам—эгіпецкі ўрад часткова неяк выканаў ультыматыўнае трэбаваньне англійскага ўраду. Адказная нота эгіпецкага ўраду, даручаная англійскаму „высокаму камісару“, кажа, што — „для добрага паразуменьня паміж абодвума краямі Эгіпет зробіць усё, на што толькі дазваляе яго ўраду канстытуцыя краю, каб задаволіць жаданьні Англіі“. Дзеля таго ўрад пастанавіў — зьняць разгляд у парляманьце новага закона-праекту аб сабраньнях (як гэтага трэбаваў англійскі ўрад), перанёсшы яго на наступную сэсію парляманту.

Але англійскі ўрад, як даносіць тэлеграма з Лёндану, прызнаў адказ эгіпецкага ўраду „незадавальняючым“... Аднак-жа даў загад эскадры англійскага флёту, якая ўжо падыходзіла да Эгіпту, вярнуцца назад — на Мальту (Мальта — востраў на Сяродземным моры—база англійскага сяродземнага флёту).

У англійскім парляманьце Чэмбэрлен зрабіў экспозэ ў справе канфлікту з Эгіптам, з якога відна, што „высокі камісар“ Англіі патрэбаваў, каб непадабаючыся англійцам закона-праект быў ня толькі зьняты з дыскусіі ў парляманьце, але—каб эгіпецкі ўрад даў Англіі пісьменную гарантыю, што ён цалком выракаецца гэтага праекту...

Цікаўна, што Чэмбэрлен абураўся на гэты праект за тое, што ён—дае за лішнюю волю грамадзянам краю на сабраньнях, — „аслабляючы ў вялікай меры адміністрацыйную ўладу, а таксама значна паралізуючы дзеяльнасьць паліцыі дый — накладаючы на паліцыю, калі яна зробіць „памылку“ ў ацэнцы палажэньня рэчаў у часе сабраньня — значна больш суровыя меры, чым на тых грамадзян, якія выклікаюць на сабраньні „разрухі“. А гэта „стварала-б паважную небясьпеку для публічнага спакою, асабліва-ж—для жыцьця ды маемасьці жывучых у Эгіпце чужаземцаў“, якіх ахову — узяў на сябе англійскі ўрад...

Трэба толькі дадаць, што — акурат такі самы закон аб сабраньнях, які накладае значна суравейшыя меры на паліцыю за яе „памылкі“ (чытай: найменшае навет умешваньне ў ход сабраньня), чым на грамадзян—за „разрухі“, існуе ні дзе інш, як у Англіі!... Але ў Англіі, бачыце,—усе англійцы: і грамадзяне і паліцыянты, дый усе грамадзяне—роўны ў сваіх правох, а чужаземцы маюць чамусьці меншыя, але ня большыя, як у Эгіпце, правы — у параўнаньні з грамадзянамі краю... Дык таму, відаць, тое, што добра для Англіі, дрэнна для Эгіпту. А дрэнна дзеля таго, што—шкодзіць там—панаваньню англійскіх чужаземцаў над мясцовым насяленьнем, якога зрачыся англійцы ня хочуць.

Гэтае „асаблівае становішча“ англійцаў у Эгіпце ясна высьветлілася на тым-жа паседжаньні англійскага парляманту. Пасьля экспозэ Чэмбэрлена прадстаўнік работніцкай партыі запытаў міністра, ці ня лепш было-б— у мэтах захаваньня сусьветнага міру — цалком вывесьці англійскія аружныя сілы з Эгіпту.

Гэта значна зьменшыла-б — казаў ён, дзяржаўныя выдаткі на збраеньні. А ўсе споры ды канфлікты паміж Англіяй і Эгіптам — ці ня лепш — было б паводле прынятага цяпер звычаю—аддаць на вырашэньне Лігі Нацыяў. На гэта „міратворэц“—Чэмбэрлен прыхільнік Лігі Нацыяў, — адказаў толькі адным словам: „Не“... Пасьля памаўчаўшы дадаў, што — „вывад англійскіх войскаў з Эгіпту выклікаў-бы там безадкладна „разрухі“...

—·—

Апошнія тэлеграмы кажуць, быццам канфлікт зусім яшчэ не зьліквідаваны.

Хаця мальтыйская эскадра быццам вярнулася назад, але — у эгіпецкіх партох і без яе шмат англійскіх ваенных караблёў і значная маса англійскага войска, гатовага да паходу...

З другога боку, эгіпецкі ўрад згадзіўся толькі адлажыць законапраект да васеньняй сэсіі парляманту, дый то — пад варункам, каб, з свайго боку, англійскі ўрад — „зьліквідаваў усе тыя ўстановы і распараджэньні, якія супярэчаць поўнай незалежнасьці Эгіпту“...

А лёнданская, асабліва-ж урадавая прэса, правакацыйна піша, што—англійскі ўрад ня спыніцца перад рашучымі мерамі, каб раз назаўсёды скасаваць спробы законадаўства ў Эгіпце, „нарушаючыя англійскія законы“...

Гэта значыць, што — у „незалежным Эгіпце“ англійскі закон стаіць вышэй законадаўчай волі сувэрэннай дзяржавы. Дык дзіва, што за гэтую сувэрэнную волю свае́й дзяржаўнасьці эгіпецкі народ будзе ўсьцяж вясьці барацьбу.

—·—

Такім чынам, канфлікт толькі адложаны. З гэтых канфліктаў, якія ня спыняюцца можа ані на адзіны дзень на ўсім прасторы раскіданых па ўсяму сьвету англійскіх „валаданьняў“ — праўных і няпраўных — ясна відаць, чаму Англія ня можа дый ня хоча— ані запраўднага разбраеньня, ані шчырага далучэньня да „трактату аб скасаваньні назаўсёды вайны, як прыладу дзяржаўнай палітыкі“,—навет такога, які прапануе вялікім дзяржавам амэрыканскі прэзыдэнт.

А гэта — таму, што — вайна зьяўляецца для Англіі якраз сталай прыладай і спосабам яе дзяржаўнай палітыкі, без якіх Англія на можа папросту ўтрымаць сваей улады над захопленымі ёй залішне вялікімі абшарамі і народамі.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Замах на сябра Радавай Гандлёвай Місіі ў Варшаве.

4-га гэтага месяца адбыўся ў Варшаве замах на сябра Радавай Гандлёвай Місіі, Лізарова. Замах адбыўся на рагу аднэй з вуліц, калі Лізароў знаходзіўся ў закрытым аўтамабілі. Замаховец даў у яго два стрэлы, але прамахнуў; за другім разам толькі асколак шкла раніў Лізарова ў локаць. Замаховец страляў 3-ці раз, але рэвальвэр асекся (зацяўся). Замаховец давай уцякаць, шофэр пусьціўся ў пагонь.

Злоўлены замаховец гэта — Юры Вайцэхоўскі, сябра Саюзу Расейскай Акадэміцкай Моладзі ў Польшчы.

Вайцэхоўскі прызнаўся да замаху, пры чым заявіў, што гэта плянаваў аддаўна. Потым аказалася (як падаюць буржуазныя газэты), што Вайцэхоўскі родам з Кіева і ня мае пашпарту і жыве ў Польшчы без дазволу ўладаў.

Калі апошняя праўда, дык відно, што расейскія манархісты маюць поўную свабоду жыцьця ў чужой-жа Польшчы.

А мы, Беларусы, пражываючыя ўсё жыцьцё ў радзімай вёсцы і маючыя ўсе „пашпарты“, ня можам навет і да суседа перайсьці, каб паліцыя ня ведала аб тым.

Якая руплівая апека над намі!?!

Польскі Урад выразіў жаль радаваму ўраду — з прычыны замаху на Лізарова.

Радавае агенцтва „ТАСС“ даносіць, што польскі пасол Патэк зрабіў візыту ў камісарыят заграніччых спраў, выразіўшы жаль з прычыны замаху на сябра Гандлёвага Прадстаўніцтва С. С. Р. Р. Лізарова, запэўніўшы, што польскі ўрад прыняў усе патрэбныя меры, каб выкрыць віноўнікаў замаху дый укараць іх, як належыць.

Нота радавага пасла Багамолава польскаму ўраду—у справе замаху на Лізарова.

У зьвязку з замахам студэнта Вайцехоўскага на радавага торг-прэда ў Варшаве Лізарова — радавы пасол Багамолаў паслаў польскаму ўраду ноту такога зьместу. Апісаўшы замах, дакананы 4-га траўня, пасол Багамолаў кажа, што замах зроблены на закрыты аўтамабіль і ў такі час, калі звычайна ён сам, пасол, выяжджае аўтамабілем на прагулку, дык ён „прыпушчае, што замах быў арганізаваны на яго дый што замаховец памылкова прыняў седзючага ў аўтамабілі Лізарова за пасла“. Далей пасол кажа, што радавае пасольства ўжо год таму — пасьля забіцьця пасла Войкава — прадставіла польскаму ўраду сьпісак асобаў тэрорыстычнай арганізацыі расейскіх эмігрантаў, у якім пад № 8 стаяў якраз гэты Юры Вайцэхоўскі, які — паводле вестак пасольства — прымаў учасьце і ў забойстве пасла Войкава. Але тады польскі ўрад адказаў пасольству, што „сьледзтва не падцьвердзіла ўчасьця Вайцэхоўскага ў забойстве пасла Войкава“.

З гэтага ўсяго пасол выводзіць, што „польскі ўрад ня прыняў ніякіх рашучых мераў для ліквідацыі існуючых тэрарыстычных арганізацыяў“. Падцьверджаньнем гэтага былі справы Трайковіча і апошняя справа Валянтыновічанкі, якая перасьцярагала аб надрыхтаваньні новага замаху. Але, ня гледзячы на гэтую перасьцярогу, „з боку польскага ўраду ня прынята ніякіх мераў для істотнага забясьпечаньня ад небясьпекі радавых прадстаўнікоў у Польшчы“.

Пасол Багамолаў зьвяртае потым увагу польскага ўраду на тое, што бела-эміграцкая прэса ў Польшчы і частка польскай прэсы выстаўляюць, як „геройскія чыны“, гэтыя ўсе замахі, якія тэрарыстычныя арганізацыі арганізоўваюць — у мэтах правакаваньня паважнага канфлікту паміж абедзьвюх суседніх дзяржаваў.

У канцы ноты пасол заяўляе рашучы пратэст „проці пасыўнасьці польскіх уладаў у справе замахаў, дадаючы, што аб усім здарэньні ён данёс свайму ўраду ў Маскву, дык — пасьля атрыманьня ад яго інструкцыяў — дазволіць сабе яшчэ вярнуцца да гэтай справы.

Нота Чычэрына.

„Pat“ падае: Чычэрын прыняў у прысутнасьці Стаманякова пасла Патка (польскі пасол ў Радах), якому даручыў ноту, заключаючую, між іншым, наступнае:

„Выпадкі астатняга году ясна выказалі брак найэлемэнтарнейшых варункаў, каторыя-б гарантавалі нармальную працу а навет бясьпечнасьць паўнамоцнага прадстаўніка СССР

Мудрыя галоўкі.

> 1-га мая ў Варшаве Пэпээсаўскія баёўкі, уваружаныя гумовымі кіямі і рэвальвэрамі, не дапушчалі далучыцца работніцкія паходы Бунду і Камуністаў, б'ючы і страляючы ў іх.
>
> З газэт.

За тыдзень перад першым маем у партыйным клюбе Пэпээсаў сабраліся ўсе павадыры на нараду. Товажышэ здэнэрвавана хадзілі па пакоі, зьбіўшыся ў грамадкі курылі. Познар з Лібэральманам сядзелі адваліўшыся на мяккай канапе і гутарылі між сабою.—Ведаеш,—гаварыў Познар,—мне аж у галаве круціцца, ды трасуцца ногі ад учарашняга; трэба пахмяліцца, але вось сабраньне—тарчы тут! Яшчэ не пачыналася, а калі яно скончыцца? Не дачакацца!—Усе-ж ужо сабраліся, толькі вось бацька Дамчынскі нешта замарудзіў!—зацеміў Лібэральман.—Нічога дзіўнага, партыйных спраў хапае, а цяпер яшчэ маршавалкоўства гэта дабавілася! І так я ня ведаю, як яго галава трывае—не разарвецца!—дзівіўся Познар—мусіць, малому бабка моцна яе сьціскала, затое і крэпкая — паясьніў яму калега. — Сяляне нас на гэты раз вывязлі—чулася гутарка з групкі, якая стаяла ля печкі—падсыпалі мы ім абяцанак: зямля бяз выкупу, сялянска-работніцкія... проціўурадавыя прамовы. Ха-ха ха! а яны дурні і вушы развесілі! Хай цяпер чакаюць, пакуль дамо!—Але, што ж далей будзе?—запытаў нехта іншы.—На другі раз ужо іх ня зловіш на гэту вудачку! Яшчэ, каб ня гэтыя „камунізуючыя“—было-б гора папалам, можна было-б і далей баламуціць і гаварылі-б сабе ў Сойме апазіцыйныя прамовы, пісалі-б у газэціне, што ня можам нічога зрабіць дзеля таго, што большасьць мае правіца, што сяляне самі ў гэтым вінаваты, бо-ж ня ўсе за нас галасавалі і г. далей, а цяпер... яны-ж, праклятыя, усю праўду аб нас раструбліваюць! Вышлі вось з Сойму ў буфэты ў часе галасаваньня над бюджэтам, дык яны-ж, злыдні, зараз—здрада пэпээсаў!—дый рассылаюць свае пісуліны па ўсёй Польшчы! Вось і рабі з імі, што хочаш! — Трэба як-небудзь пазатыкаць ім морды, інакш нічога ня будзе—скампрамітуюць нас зусім! Пры наступных выбарах не паказвайся ўжо і на вёску— пагоняць сяляне бруднымі мётламі.—І чорт іх ведае! Так-жа-ж, здаецца, іх не шкадуюць усе турмы перапоўнены, а вось растуць, нібы грыбы пасьля дажджу—ня так, як у нас...

Нічога! Няварта, калегі, заўчасу бядаваць, чуўся голас першага, можа да таго часу іхніх галасоў зусім і патрабаваць ня будзем! — Праўда, яно то ўжо да гэтага схіляецца...—У гэты час увайшоў, з партфэлям пад пахай, „таварыш“ Дамчынскі. — Усе ўжо сабраліся?—запытаў ён, падыходзячы да стала.—Усе! Даўно! Ужо з паўгадзіны чакалі на Вас пан... товажышу — адказалі яму. — Раней ня мог, трэба было з тым-сім парадзіцца! Дык вось, „товажышэ“,—пачаў, абапёршыся аб стол, сваю прамову „бацька“ — сабраў я вас дзеля таго, каб парадзіцца, ці сёлета будземо абхадзіць першага мая, ці не?—Ня трэба! Будзем! Пашто? Камуністыя загарнуць работнікаў!—панясьліся выкрыкі сяброў. Так, „товажышэ“, — прадаўжаў прамоўца, я таксама думаю, што гэта зусім лішняе, бо чаго ж нам больш трэба, супраць каго дэманстраваць? Свабоду-ж мы маем паўнейшую, навет на цяперашні ўрад вярні, што хочаш! Маем цёплыя пасады, наш чалавек міністрам, свае людзі ў розных „ужэндах“, камісіях, дык чаго-ж нам яшчэ дамагацца?—Праўда! праўда!—здазвалася некалькі галасоў—лепшага нам не дачакаць! Трэба толькі дбаць, каб гэта ня страціць! — Вось яно-ж!—гаварыў далей маршавалак.—Справа ў тым, што калі ня выйдзем, дык гэны зараз і панясуць.—Здрада пралетарыяту! Прадаліся буржуазіі! — Павядуць супроць нас агітацыю і падарвуць астаткі нашых уплываў на работніцка-сялянскія масы, а тады і ўрад можа перастаць з намі лічыцца! Падумайце аб гэтым, калегі, дый парадзьце, што рабіць? —Трэба абходзіць! Трэба! Нічога не парадзіш!—зашумелі сябры.—Гэтую справу стаўлю на галасаваньне, хто за тое, каб абходзіць—падніміце рукі! — скамандаваў Дамчынскі. Раз... два... дзесяць... — лічыў ён, апусьціце! Чуць ня ўсе, добра,—знача выступім! Цяпер другое пытаньне, як нам зрабіць, каб замест дэманстрацыі нашай сілы і ўплываў ня вышла наадварот? Работнікі ўжо коса паглядаюць на нас, а калі злучацца ў паходзе з камуністымі, дый яшчэ тыя падбурацъ—паплывуць усе за імі, а мы можам застацца толькі са штандарамі! Як тут зрабіць? Думайце! Прапаную, хто хоча, выказацца ў гэтай справе! — сказаў правадыр правадыроў і адыйшоў трохі ў бок. Да століка падскочыў баявы партыец Зарамбайка.— Трэба—пачаў ён,—не дапусьціць, каб злучыліся, а зрабіць гэта, памойму, трэба вось як: верных сабе людзей, дзякаваць Богу, маем, дык дадзём ім гумовыя палкі, акружым імі наш паход, і калі тыя будуць лучыцца—лупіць бязлітасна! — Праўда! Добра!—адазваліся некаторыя.—Ня зусім „товажышэ“!—сказаў правая рука маршавала—Д'ябланд—палкі-ж і яны могуць мець, палкамі нічога не парадзіш! Трэба дастаць цяжарныя самаходы, уваружыць нашых рэвальвэрамі і калі што, дык страляць гэту сволач, душыць іх калёсамі!—Брава! Біс! Правільна!—грымелі прысутныя.—А калі нашы работнікі папруцца да іх, што тагды?—запытаў у прамоўцы пасол Бездзялкоўскі. — Біць тады і сваіх, нечага шкадаваць!—адказаў той.—Але лепш папярэдзіць іх раней, што калі хто папрабуе гэта зрабіць — зараз выляціць на вуліцу і будзе цягацца галодны! Нябось пабаяцца! Яны будуць ведаць, што гэта ня пустая пагроза толькі! Ня хочучы, заплакаўшы, пойдуць пад нашай камандай!—Разумна гавора! Не здарма яго выбралі ў заступнікі бацьку! — загаманілі пэпээсаўскія галавары.—Хто яшчэ мае гаварыць?—запытаў маршавал.—Ніхто? Талкова, вы, мальцы, гаварылі, малайцы, навастрыліся ўжо! Дык табе Д'ябланд даручаю дабраць баявых хлапцоў, а самаходаў і рэвальвэраў дастанем, колькі будзе трэба! — Слухаю!—адказаў той, стаўшы на „смірна“.— А ты Зарамбайла сʻрганізуй пяхоту, дастань гумоўкі! Найбольш паставіш людзей ззаду, але трэба, хоць і радзей, паставіць па бакох, на выпадак, калі каторы з нашых захоча вылучыцца.—Добра, пастараюся! — пакланіўшыся, адказаў сьвежасьпечаны капітан гумавікоў.—Каму гаварыць прамовы назначу пасьля. Галоўнае старайцеся застрашыць работнікаў, каб яны, чаго добрага, ня рынуліся да гэных—прапалі мы тады ўсе!—Пра гэта і гаварыць ня трэба, самі ведаем! Можна, дзеля пастраху, з якой хвабрыкі і цяпер некалькі выкінуць!—адазваліся кумпаны. — Праўда, вучыць вас ужо не патрабую, самі добра кумекаеце! Пытаньняў ніякіх больш ня маеце?—запытаў павадыр. Ну тады паседжаньне замыкаю, можаце разыходзіцца! Познар толькі гэтага і чакаў: схапіў капалюш, ды хутчэй у дзьверы! Важна выйшаў маршавал, а за ім і ўсе памалу пачалі разыходзіцца, шумна гаворачы між сабой. — Задамо ім перцу, аж сваіх не пазнаюць!—чулася ўжо з калідору— ха! ха! ха!

П. Асана.

у Варшаве. Ледзьве прайшло 11 месяцаў ад часу трагічнай сьмерці паўнамоцнага прадстаўніка Войкава і вось дывэрсыйныя элемэнты 4 мая споўнілі замах на жыцьцё гандлёвага прадстаўніка СССР Лізарова, які толькі, дзякуючы прыпадковаму зьбегу акалічнасьцяў, не пацягнуў трагічнага наступства. Іншыя, папярэднія акалічнасьці паказваюць, што чыннасьць дывэрсыйных элемэнтаў скіравана проці бясьпечнасьці паўнамоцнага прадстаўніка СССР ў Польшчы— ня зьменшылася навет ў часе, разьдзяляючым гэтыя выпадкі. Цьверджаньні, быццам усе гэтыя замахі ня мелі з'арганізаванага характару, прадстаўляючыя іх, як адасобены ўчынак, знаходзячыхся прыпадкова на польскім абшары, экзальтаваных і неадказных адзінак, цьверджаньні гэтыя скасаваны самым лікам гэтых замахаў, як роўна і фактам, што такія замахі ня мелі мейсца ў Польшчы ў мінулым годзе, хаця тыя-ж самыя, быццам экзальтаваныя і неадказныя адзінкі, жылі тады таксама ў Польшчы.

З увагі на сытуацыю, у якой знайшлося прадстаўніцтва СССР ў Польшчы, ноты ўраду СССР, высланыя па поваду забойства паўнамоцнага прадстаўніка Войкава, зьвярталі ўвагу, ня толькі на дзеяльнасьць тэрорыстычных арганізазацыяў і эмігрантаў, якая ўзрасла з вядомымі выпадкамі мінулага году, але і на звычайныя прыхільныя варункі, якія знаходзяць ў Польшчы гэтыя арганізацыі пры выпаўненьні сваей дзеяльнасьці (zbrodni).

Гэтая сытуацыя ўтварылася дзякуючы таму, што ў Польшчы сабраліся вялікія масы авантурыстычных элемэнтаў з белай эміграцыі, як роўна і з прычыны існаваньня белай прэсы, выразна сымпатызуючай, з скіраванымі проці ўрадавых прадстаўнікоў тэрорыстычнымі ўчынкамі і з поваду істотнай бязкарнасьці, з якой спатыкаюцца апініі, выказваныя гэтай прэсай, што якраз і падахвочвае да тэрорыстычных учынкаў.

Як ведама, вялікія масы белых эмігрантаў згрупаваны ў многіх другіх дзяржавах Эўропы, у якіх таксама ёсьць прадстаўнікі ССРР. Аднак-жа, ні ў якой з тых дзяржаў дзеяльнасьць тэрорыстычных арганізацый эмігрантаў не магла прыбраць такіх разьмераў, да якіх яна дайшла ў мінулым годзе ў Польшчы. Гэта адносіцца і да іншых дзяржаваў, суседніх з ССРР на Усходзе, ня гледзячы на тое, што тэрорыстычныя арганізацыі стараліся і стараюцца ўжыць, галоўным чынам, суседнія з ССРР дзяржавы, як падставу сваей дзейнасьці проці ССРР.

Вачавідна, загады проці авантурыстычных элемэнтаў расейскіх эмігрантаў у іншых краёх больш, як у Польшчы, утрудняюць дзейнасьць тэрорыстычных арганізацыяў, якія баяцца рэпрэсіяў, роўна, як проці адзінак, так і проці арганізацый ці групы эмігрантаў. Вачавідная справа, што тут і ёсьць повад, дзякуючы якому тэрорыстычныя арганізацыі нідзе так лёгка не знаходзяць выканаўцаў сваіх авантур як у Польшчы. Гэтым спосабам Польшча зрабілася арэнай вайны тэрорыстаў з ССРР, якую вядуць эміграцкія арганізацыі, атрымліваючыя помач і матар'яльныя сродкі з таемных крыніцаў, заінтэрасаваных у ўтварэньні камплікацыяў паміж ССРР і другімі дзяржавамі.

З прычыны забойства паўнамоцнага прадстаўніка ССРР Войкова, польскі ўрад выдаліў 5 эмігрантаў і абвясьціў эмігрантам перасьцярогу, каб не надужывалі праў азылю (прытулку). Аднак-жа ўсе гэтыя выдаленыя вярнуліся ў Польшчу ізноў; а што да эфэкту памянёнай перасьцярогі, то аб ім можна судзіць на падставе замаху Трайковіча, справе Валентыновічанкі, а нерадусім, на падставе факту, што прэса белых эмігрантаў у Польшчы яўна займаецца глёрыфікацыяй (праслаўленьнем) учынку Кавэрды. Некаторыя апініі, выражаныя гэтай прэсай, ня могуць быць іначай ацэніваны, як беспасярэдняе захвочваньне да новых тэрорыстычных учынкаў.

Усё гэта вышэй выказанае ясна характарызуе нявыстарчальнасьць загадаў польскага ўраду проці авантурыстычнай дзеяльнасьці белых эмігрантаў, скіраванай ня толькі проці жыцьця радавых прадстаўнікоў, а і на тое, каб выклікаць паважны канфлік паміж абедзьвюма дзяржавамі. Тымчасам гэтыя невыстарчаючыя загады зрэдукаваны да нуля з прычыны станоўча надзвычайнай пасыўнасьці польскіх уладаў. Досыць зазначыць, што няма ніякіх распараджэньняў адносна замахоўцы ў дзень 4 г. месяца Юрага Вайцэхоўскага, як гэта зазначыў паўнамоцны прадстаўнік Багамолаў у сваей ноце 5 г. м., два разы зьвярнуў увагу польскаму ўраду на авантурыстычную дзейнасьць гэтага эміграната, які адыгрываў чынную ролю ў манархістычных колах і сярод расейскіх эмігрантаў-тэрорыстаў у Польшчы, быў папярэдня старшынёй саюзу расейскай моладзі і выракся свайго становішча ў управе гэтага саюзу нядаўна перад замахам, праўдападобна з мэтай захаваньня гэтага саюзу ад могучых паўстаць рэпрэсіяў у сувязі з замахам.

Дзякуючы бяздзейнасьці польскіх уладаў, польска-радавыя адносіны знайшліся ў працягу апошняга году ў істотнай залежнасьці ад цёмных сілаў, працуючых сярод белых эмігрантаў. Авантурыстычная прапаганда магла пагражаць, ня толькі жыцьцю прадстаўнікоў ССРР у Польшчы, але і прычыніцца да нараженьня на небясьпеку інтарэсаў Польшчы ў тым мамэньце, у якім захочуць іх кіраўнікі пратэктары і патроны і якую лічаць гэтага для сябе карыснай. Урад Саюзу Радаў лічыць, што польскі ўрад мае быць пераканаты, што сытуацыя, вытвараная ўказанымі акалічнасьцямі, становіць беспасярэднюю пагрозу для адносінаў паміж ССРР і Польшчай і, у кансэквэнцыі (далей) не павінна быць больш цярпіма, і што маюць быць адразу-жа зроблены энэргічныя распараджэньні, маючыя на мэце запэўненьне паўнамоцнаму прадстаўніку С.С.Р.Р. у Польшчы запраўднай бясьпечнасьці і нятыкальнасьці, а разам і ахову радава-польскіх адносінаў перад бязупынным наражаньнем іх на небясьпеку. Урад Саюзу Радаў чакае ад польскага ўраду хуткага паведамленьня ў справе зробленых ім распараджэньняў дзеля энэргічнага зьліквідаваньня тэрорыстычнай дзейнасьці белых эмігрантаў у Польшчы.

Польска-радавыя адносіны.

Радавая прэса, абгаварваючы канфэрэнцыю польскага пасла ў Маскве п. Патка з радавым пaслом у Польшчы Богомолавым, прадбачыць далейшыя пасьпехі на шляху добрых адносінаў паміж Польшчай і ССРР. Прэса прадбачыць, што зараз-жа пасьля павароту п. Патка ў Маскву—4 траўня—будзе падрыхтаваны да канчальнага падпісу гандлёвы трактат паміж абодвума краямі.

Пазнань і... Стоўпцы — па 500 зл. на Міцкевіча.

У мясцовых газэтах надрукавана справаздача камітэту будовы памятніка Міцкевічу. З справаздачы адзначаем надзвычай цікаўную пару лічбаў.—Камітэт зьвярнуўся да ўсіх меставых і мястэчкавых самаўрадаў Польшчы па ахвяры на памятнік. І вось, паміж іншымі, адгукнуліся — места Пазнань, здаецца, найвялікшае дый найбагацейшае, пасьля Варшавы, у Польшчы, і—наша павятовае беднае глухое беларускае места Стоўпцы,—ахвяраваўшы на памятнік польскаму паэту, родам беларусу—абодва па 500 злот.

Пазнань, здаецца, лічыцца ў Польшчы цытадэляй баявога эндэцкага польскага нацыяналізму... Праўда, за стаўпецкі магістрат беларускі народ не адказвае, бо трэба думаць,—ня ён выбіраў яго, а польскі самаўрад места так сабе—„сам выбраўся“.

Эха сьвяткаваньня І-га мая ў Варшаве.

2./V. г. г. памёр у бальніцы сьвят. Роха 19 гадоў Чэслаў Блаховіч, работнік, які быў падстрэлены пэпэсамі ў часе сьвяткаваньня 1-га мая на Тэатральным пляцу ў Варшаве. Арышты ў Варшаве—у сувязі з сьвяткаваньнем першага мая прадаўжаюцца. Арыштаваны 12 чалавек: 2 вучні, 1 студэнт, 1 насільшчык („tragarz“), 2 канцылярысты, 1 пекар, 1 работнік, 2 сталяры, 1 каменшчык нейкі Райнецкі, які нёс камуністычны транспарант.

Заграніцай.

Аканчальныя вынікі выбараў у Францыі.

Францускае міністэрства ўнутр. спраў апублікавала наступныя вынікі выбараў у францускі парлямант, якія мы тут падаем з лікам паслоў выменяных партыяў у папярэднім парляманьце ў дужках.

Саюз рэспубліканска дэмакратычны 145 (98). Рэспубліканская лявіца—106 (80). Радыкальная партыя (група пасла Даладора (Daladoer'a) 103 (146). Сацыялісты-рэспубліканцы 47 (25). Сацыялісты (аб'яднаньня) 101 (106). Камуністы 14 (26). Сацыялісты-камун. 2 (3) і аўтанамісты—3 (0).

Як бачым, дык буржуазныя партыі (ўрадавая Пуанкарэ і згодніцкія з ею) павялічыліся коштам лявіцы, як сацыялістаў, якія ўтрацілі 5 мандатаў і камуністаў, якія ўтрацілі аж 12 мандатаў.

Узрост буржуазных партыяў тлумачыцца друмя прычынамі—1) спрытная перадвыбарная камбінацыя Пуанкарэ з фінансамі, дзякуючы чаму франк часова перастаў падаць (так, як у Польшчы дарагавізна перад выбарамі), але потым ён сваё нагоніць (!) (так, як у Польшчы дарагавізна па выбарах); другая прычына ў тым, што і ў Францыі стасаваліся ўрадам рэпрэсіі і ўневажненьні галасоў, галоўным чынам, проці камуністаў, якія, ня гледзячы ні на якія перашкоды, атрымалі (паводле францускай-жа буржуазнай прэсы) больш галасоў, чым у папярэднія выбары.

Урад Пуанкарэ ня выйдзе ў адстаўку.

Рада міністраў, бачучы ў рэзультатах апошніх выбараў адабрэньне палітыкі ўраду, пастанавіла—ня выходзіць у адстаўку, але зьявіцца на першае паседжаньне новага сойму — 1 чэрвеня ў тым самым складзе. Толькі вось—на выбарах усё-ж адзін з міністраў праваліўся, гэта Фальер, міністар працы. Дзеля таго гэты міністар адзін падаўся ў адстаўку, якая і прынята габінэтам.

Вэнгерскі ўрад трэбуе выдачы Бэла-Куна.

Вэнгерскі ўрад зьвярнуўся афіцыяльна да аўстрыяцкага — з дамаганьнем выдачы Бэла-Куна, пазываючыся на істнуючую умову паміж Аўстрыяй і Вэнгрыяй, — дый на тое, што ўсьцяж лічыць Бэла-Куна грамадзянінам Вэнгрыі... Пастановы аўстрыяцкага ўраду яшчэ няма. У вэнгерскай прэсе зьявілася „гутарка“ з паслом аўстрыяцкага парляманту, які заявіў, што Аўстрыя ня можа выдаць Бэла-Куна, не пагвалціўшы гэтым сваіх законаў.

Пастанова Найвыш. Трыбуналу ў справе „чырвоных баёвак“ у Нямеччыне.

У галоснай справе цыркуляру нямецкага міністра ўнутраных спраў да ўсіх краёў Саюзнай Рэспублікі — аб тым, каб яны распусьцілі ў сябе так-званыя „чырвоныя баёўкі“,—Найвышэйшы Трыбунал Рэспублікі — з прычыны пратэсту 16 саюзных дзяржаваў Рэспублікі—прызнаў гэты цыркуляр не абапертым на канстытуцыі і дзеля таго—незабавязваючым.

Дэмакратычная прэса Нямеччыны трыўмфуе з гэтай прычыны, падчырківаючы з задаваленьнем, што „гэты манэўр нацыяналістаў пацярпеў крах“.

Хатняя вайна у Кітаі.

Новае паражэньне войска Чанг-Тсо-Ліна.

У Пэкіне апублікавана вестка — аб тым, што паўночная армія ізноў панесла значнае паражэньне напоўначы прав. Шан-Сі і адступае далей напоўнач у кірунку Та-Ун-Фу, куда прывезена 4.500 раненых. Войска Чанг-Тсо-Ліна ўсьцяж адступае ў напрамку Пэкіна. З другога боку фронта пацьвярджаецца вестка аб разьбіцьці паўночнай арміі ў правінцыі Шантунг і заняцьці паўдзённай арміяй Ці-Нан-Фу.

Паўдзённая армія—у 250 кілям. ад Пэкіна.

Маскоўскі ўрад атрымаў вестку з Кітаю, што авангарды паўдзённай арміі знаходзяцца ў адлежнасьці 250 кілям. ад Пэкіна.

Сэнсацыйнае паразуменьне паміж паўдзённай арміяй і японцамі (?).

Японскі міністар заграгічных спраў заявіў, што вышэйшае камандаваньне нацыянальных арміяў згадзілася на тое, каб атрад японскага войска, якое высадзілася ў Тсінь-Тао, без перашкодаў дайшоў да сталіцы Шантунга Тсі-Нан-Фу. Такое мірнае паразуменьне (?!) японцаў з паўдзённым камандаваньнем зьяўляецца зусім новым фактам у хатняй вайне ў Кітаі. Ці гэта азначае, што Японія цалком адмаўляецца ад падтрыманьня Чанг-Тсо Ліна, з якім у апошні час запраўды яе адносіны значна папсаваліся. Калі гэта паразуменьне запраўды выяўляе новы зварот (?) японскай палітыкі ў Кітаі — пераход на бок паўдзённых арміяў, тады трэба думаць — песьня Чанг-Тсо-Ліна будзе хутка дапяяна да канца.

Японскія „закусы“ на Манголію.

З Масквы паведамляюць, што сюды прыяжджаў ведамы японскі палітык барон Окура, які меў даручэньне ад свайго ўраду—дабіцца ад радавага ўраду — дапушчэньня японскага капіталу ў Манголію. Але — ня гледзячы на карысныя кампэнсацыі, радавы ўрад рашуча адхіліў дамаганьні Японіі. Бо ж ведама, што заўсёды — усьлед ды побач з „капіталам“ ідзе капіталіст, а ўсьлед за капіталістам ідзе і азброены да зубоў — імпэрыяліст...

Баі між паўдзённай арміяй і японцамі.

Як і можна было спадзявацца, існаваньне дзьвюх ваенных уладаў на аднэй тэрыторыі Шантунгу, прытым — аднэй законнай і нацыянальна кітайскай, а другой — бясправўнай, акупацыйна-японскай — павінна было выклікаць канфлікт. Паўдзённая армія, гэта-ж—ня тое, што армія Чанг-Тсо Ліна, якому японцы маглі загадваць, як свайму найміту, дый той навет у апошні час неяк „адбіўся ад рук Японіі“. Паўдзённая армія, гэта-ж — ваенная прылада нацыянальнай волі сьведамага свайго права і сваей сілы кітайскага народу, які пастанавіў — за ўсялякую цану стаць нарэшце на дзеле вольным гаспадаром свае зямлі. Дык дзіва, што, навет згадзіўшыся на праход японскага атраду ў Тсі-Нан-Фу — „дзеля аховы японскіх грамадзян і іх маемасьці“, камандаваньне кітайскай арміі лічыла сябе, а не японскіх акупантаў, гаспадарамі краю. Дык тое сэнсацыйнае „паразуменьне“, аб якім данесьлі тэлеграмы, аказалася вельмі сумліўным, ня трывалым, а, трэба думаць, папросту правакацыйным з боку Японіі. Японцы, ведама-ж, прызвычаіліся лічыць сябе гаспадарамі кітайскай зямлі. Дык няма нічога дзіўнага, што ў такіх абставінах—ружжа самі пачалі страляць. Апошнія тэлеграмы кажуць, што паміж японскімі войскамі і войскам паўдзённага Кітаю адбыліся вельмі крывавыя сутычкі—амаль не запраўдныя баі. Кітайскае войска атакавала японскі атрад, японцы адказалі контр атакай. У рэзультаце — шмат забітых і раненых з абодвых бакоў. Пасьля перарыву зробленага пад націскам галоўных уладаў японскай і кітайскай, бой узгарэўся ізноў, ізноў распачаты кітайскім войскам, якое—у 3 гадзіннай барацьбе разьбіла японскі атрад (?) і пабіла японцаў і інш. чужаземцаў у Тсі Нан-Фу. Так прынамсь даносяць японскія і англійскія крыніцы.

Страты японцаў, аднак—значна меншыя, як кітайцаў.

Атрымаўшы вестку — аб небясьпецы, японскія ваенныя ўлады выслалі ў Тсі-Нан-Фу ўсе ваенныя сілы, якія былі ў Тсін Тао— у лічбе 2.300 жаўнераў. Усе баі йшлі пад сталіцай Шантунга, Тсі-Нан-Фу, якая зьяўляецца важным стратэгічным пунктам у камунікацыйнай лініі, лучачай галоўныя шляхі і цэнтры Паўдзённага Кітаю з падступамі да Пэкіну. Дык ясна, што—якраз з-за гэтага вялізарнай вагі стратэгічнага пункту і ідзе барацьба. Аддаць Тсі-Нан-Фу ў японскія рукі паўдзённая армія ня можа: гэта значыла-б аддаць на японскую ласку лёс усей кампаніі, пасьпех усей справы. А Японія якраз і хоча—мець гэты лёс у сваіх руках... Дык трэба спадзявацца якіх-сь рашучых крокаў. Рашучы зваротны мамэнт настаў. Ці будзе Японія надалей ратаваць Чанг-Тто-Ліна ці, пачуўшы большую сілу Поўдня, запраўды пойдзе на паразуменьне з ім.

Кітайска-японская вайна.

Ваяўнічы настрой у Японіі.

З Токіо пішуць, што „ў краі выпадкі ў Тсі-Нан-Фу выклікалі страшэннае абурэньне“.—Настрой—падобны да настрою ў 1914 г. Урадавыя колы лічаць перагаворы з Чанг-Кай-Шэкам бязмэтнымі...

Японскі флёт ідзе ў кітайскія воды.

Японскія марскія ўлады выслалі ў кітайскія воды 19 мінаносцаў. Усяго японскіх войскаў пакуль што ў Кітаі—13.000. На чале іх стаіць былы ваенны міністар ген. Угакі.

Японскі атрад адрэзаны і разьбіты.

Японскі атрад, які меў заняць Тсі-Нан-Фу, быў канчальна разьбіты пераважаючымі—ў 8 разоў большымі сіламі авангарду Чанг-Кай-Шэка.

Далейшыя падмогі японцаў ня могуць дайсьці да Тсі-Нан-Фу—бо кітайцы ўзрвалі мост праз раку, адрэзаўшы такім чынам японскі атрад ад яго базы ў Тсін-Тао. Як пішуць, пад Тсі-Нан-Фу быў прысутны дый кіраваў атрадам сам Чанг-Кай-Шэк, які не пабаяўся кінуць вызаў магутнай Японіі, каб гэтым падняць ваяўнічы дух у кітайскім народзе.

Разрыў зносінаў між Японіяй і Нанкінам.

Японскі прэм'ер гр. Танака заявіў, што японскі ўрад пастанавіў—разарваць стасункі з урадам Чанг-Кай Шэка. Ці гэта значыць, што Японія афіцыяльна абвяшчае нанкінскаму ўраду і паўдзённым арміям вайну?

„Падпаліваньне“ ваеннага пажару японскімі карэспандэнтамі.

Японскія карэспандэнты пішуць у японскія газэты — аб страшэнных зьверствах, быццам дакананых кітайцамі над японскімі жаўнярамі, цывілямі ды жанчынамі ў Тсо-Нан-Фу.

Баі пад Тсі-Нан-Фу ідуць усьцяж.

Тэлеграма ад 7 траўня кажа, што дагэтуль баі за валаданьне Тсі-Нан Фу ідуць між японцамі і паўдзённай арміяй бясспынна. Японцаў кітайскае войска б'е дый выпірае з места.

Нота пратэсту кітайскага ўраду—Японіі.

Мін. загран. спраў Нанкінскага ўраду даручыў японскаму паслу ноту, у якой пратэстуе проці высылкі войскаў у Шанхай і Тсі-Нан-Фу, якая — пагвалціўшы сувэрэннасьць Кітаю, выклікала і сумныя выпадкі пад Тсі-Нан Фу і пад Шанхаем. Адказнасьць за гэтыя выпадкі нота цалком (дый зусім слушна) ўскладе на японскі ўрад. У канцы нота востра пратэстуе проці—тых зьверстваў, якія дапушчаны былі японскім войскам над паслом Нанкінскага ўраду, якога яны забілі, сьпярша абрэзаўшы яму вушы дый усялякімі спосабамі скатаваўшы яго.

Нэйтралітэт ССРР.

Радавая прэса з вялікім напружаньнем сачыць за развіцьцём падзей у Кітаі. Прэса прадбачыць умяшаньне дзяржаваў, сцьвярджае імкненьне Японіі да разьбіцьця сілы і ўплываў у краі паўдзённага ўраду. Але заяўляе, што ССРР захавае поўную нэйтральнасьць. Японскі пасол у Маскве 7. V. 1928 г. доўга канфэраваў у кам. загран. спраў — у справе выпадкаў у Кітаі.

Нэйтралітэт Амэрыкі (?).

Марское міністэрства штатаў заяўляе, што ў кітайскіх водах стаіць 61 ваенных краблёў амэрык. флёту—з 11.000 матросаў і жаўняроў. Гэтыя сілы будуць пушчаны ў ход, калі выпадкі будуць гэтага вымагаць. Але пакуль што ўмяшаньне Амэрыкі ў выпадкі ў Шантунгу—ня мае прычыны.

Наша хроніка.

Маніфэстацыя камуністычных паслоў на судзе Грамады“. 4 г. месяца на судзе „Грамады“ былі прысутныя (ад самага рана) камуністычныя паслы: Варскі, Бітнэр, Росяк, Гавроскі пасол украінскага Сельробу лявіцы — Вальніцкі.

У часе перарыву пасол Варскі шыбка ўстаў і зьвярнуўшыся да абвіняямых крыкнуў: „Прывітаньне і чэсьць грамадаўскім паслам ад работніцкай Варшавы праз мяне, як дэлегата камуністычнай фракцыі Польскага Сойму ў Варшаве!“ Старшыня загадывае „usunąć“ дэманстранта. На „alarm“ камэнданта канвою ўбягае паліцыя і акружае абвінавачаных (грамадаўцаў).

У гэтым часе другі дэманстрант, пасол Бітнэр, крычыць: „Чэсьць Грамадзе ад Лодзкіх работнікаў“!

Паліцыя энэргічна забралася „у сувязь“ паслоў, а тады пасол Вальніцкі (Сельроб — лявіца) крычыць на цэлы голас па ўкраінску: „Чэсьць Грамадзе ад працоўных Украіны“.

Паліцыя адвяла дэманстрантаў да дыжурнага пакою ахвіцэра паліцыі, гдзе па вылігітымаваньні і сьпісаньні „адносяага“ пратаколу іх адвялі за выходныя дзьверы, на свабоду.

Гэтыя дэманстранты прыбылі разам з карэспандэнтамі „Тасс'у“ і „Известий“ (савецкая прэса).

І-га траўня ў Наваградчыне. У Лідзе, у часе паходу арыштавана 3 сяброў ППС — лявіцы, якія быццам прабавалі нарушыць „цішыню“.

У Дзярэчыне арыштаваны Ян Зубрык,

„за арганізаваньне веча без дазволу ўладаў і за процілаліцыйнае выступленьне".

У Слонімскім павеце было вывешана 16 сьцягаў з антыдзяржаўнымі лёзунгамі. 2 такія сьцягі былі вывешаны ў Наваградку, 1 у Шчучыне.

Перадаюць цікавыя падробнасьці палажэньня ў Наваградку. На месцы знаходзіліся паслы Дварчанін і Стагановіч. Веча і паходу па розных прычынах не рабілі, аб чым была зараней пастанова. Але, ня гледзячы на гэта, самая толькі прысутнасьць паслоў нарабіла клопату адміністрацыі. Готэль, дзе былі паслы, уноч перад 1 тр. аж чатыры разы адведаў сам рэфэрэнт бясьпечнасьці. За готэлем і за самымі паслаамі зроблены зусім такі яўны нагляд тайных агентаў, якія хадзілі проста па пятах паслоў. Па месту праз увесь час туды і сюды праходзіла цэлая дэфіляда паліцыі з голым аружжам. У канцы вуліц была пастаўлена стража, якая задзержвала людзей, пытаючыся і запісваючы прозьвішчы. Ня вельмі шчасьлівыя былі і людзі, якія выпадкова начавалі ў адным готэлі з пасламі. Проста—весела.

Высвабадзеньне сэн. Рагулі. 7 траўня Сэнат пастанавіў спыніць да часу валаданьня мандату ўгалоўнае сьледзтва проці сэн. Рагулі. У той-жа дзень з міністэрства было перадана аб гэтым у Віленскі Апэляцыйны Суд і 8 траўня сэн. Рагуля быў выпушчаны на волю.

Пастанову аб спыненьні суда Сэнат вынес большасьцю галасоў усіх партыяў, апрача хадэкаў, пасьля дакладу сэн. Ахматовіча з „Адзінкі", які сказаў, што цяпер Рагуля „далёкі ад камунізму".

Арышт б. пасла Ю. Сабалеўскага. На днях заарыштаваны і прывезены на Лукішкі б. пасол Ю. Сабалеўскі ў зьвязку з працэсам Грамады, які выявіў долю і яго ўчасьця—у працы гэтае партыі.

„Ляжачага ня б'юць" — кажа пагаворка, і мы ня будзем нічога казаць дрэннага аб б. паслу Грамады цяпер, але няхай гэты арышт пакажа іншым „угоднікам", што можа чакаць іх навет пры сытуацыі, падобнай данаму выпадку.

Суботнік у Віленскай Беларускай Гімназіі. У суботу 12. V. г. г. адбудзецца суботнік у Віленскай Белар. Гімназіі.

Праграма суботніку: 1) „Чорт і баба"—Аляхновіча, 2) Хор пад кіраўніцтвам гр. Шырмы, 3) Духовы аркестр і 4) Дэклямацыя.

Пачатак ў $7^1/_2$ гадз. Уваход па запросінах.

Сацыялістычны магістрат. Як падае „Жэчпосполіта" № 128, беластоцкі магістрат пастанавіў звольніць 1 траўня ад працы ўсіх гарадзкіх работнікаў.

Калі гэта праўда, то чэсьць беластоцкаму магістрату!

Бальшавіцкая часопісь у Вільні. (?) Буржуазныя газэты падаюць, што ў Вільню прыехаў з Варшавы прадстаўнік „савецкага" „Гос-Издательства" з намерам залажыць у Вільні сваю часопісь у расейскай мове.

Далей газэты дадаюць, што ходзяць чуткі, быццам гэты прадстаўнік ужо шукае друкарні і супрацоўнікаў, якім будзе плаціць даларамі.

Ці ня „смажаная качка" віленскіх манархістаў гэтая бальшав. газэта ў „rdzennie" польскай Вільні?!?

Канфіската аднаднёўкі. Віленскія ўлады сканфіскавалі аднаднёўку „Sprawa Zawodowa", выданую П.П.С.-лявіцаю, якая мелася быць [illegible] (разносна прадаванаю) у дзень 1-[illegible] мая.

К[illegible] можна, а каму не? Ня так даўна польская [illegible] падала весткі аб арыштах людзей на [illegible], якія зьбіралі ахвяры на Грамаду,—грошы сабраныя канфіскаваліся.

А цяпер вось што дзеецца на нашых вачох. Расейскія манархісты, чорнасоценцы свабодна зьбіраюць ахвяры на карысьць князя Мікалая Мікалаевіча. Квіточкі з падзякаю за ахвяру прысланы аж з Парыжу.

У першым выпадку беларус-грамадзянін Польшчы ня мае ходу, — у другім чорнасоценец расеец—„obcokrajowiec" „gościnnie" робіць, што яму падабаецца.

Праўда, што крук круку вока ня выдзяўбе.

Кракадылевы сьлёзы. У № 9 спадароўскага „воргану" „Народу" з 30. IV. 28 г. зьявілася перадавіца нейкага Прынскага пад загалоўкам — „Як запраўды было на выбарах", дзе аўтар яе ліе „горкія сьлёзы" аб тым, што быццам прыхільнікі радыкальнай беларускай прэсы (па іхняму інтэрнацыяналісты) вельмі пашкодзілі для беларусаў на выбарах, і шчыра абараняе новастворaную шопку для разьбіваньня адзінага сял.-работніцкага руху—„Беларускую Сялянскую Партыю".

Ен кажа, што мы (зн. „спадароўцы"), каб не пашкодзіць справе беларусаў на выбарах, у тых вакругох, дзе былі вялікія ўплывы „Грамады" — адмовіліся ад дзеяльнасьці і сваіх уласных сьпіскаў не выстаўлялі.

Значыцца „пашкадавалі"?

Добра! Калі так, дык нашта-ж вы выстаўлялі свой сьпісак у Наваградзкай вакрузе, дзе былі абсалютныя ўплывы б. „Грамады"? Нашто вы там „забралі" (чытай купілі за грошы) некалькі сот галасоў, у той час, як для правядзеньня чацьвертага запраўднага сял.-работніцкага пасла не хапіла толькі 90 галасоў.

Значыць так „пашкадавалі"?

Кажаце, што позна ўзяліся там „хадацца". Чаму-ж у Лідзкай вокрузе, дзе вы адначасна пачалі працаваць (чытай падшываньца пад сял.-работніцкіх правадыроў), чаму там, дзе ўсе сял.-работніцкія сьпіскі былі зьліквідаваны, вы пры помачы фальшывага назваўшы сябе нейкай нацыянальнай часткай „Грамады", якой ніколі не існавала, бо „Грамада" мела адну праграму і ніякіх там частак не магло быць, чаму там вы правялі двох сваіх „спадароўцаў"—новых „Паўлюкевічаў", новых два тормазы ў адраджэньні беларускага працоўнага народу?!

Чаму там ня позна? Ці вельмі проста. Не выстаўлялі вы сваіх сьпіскаў у пэўных акругох таму, што не маглі знайсьці такіх ліку падпісоў у беларускім Народзе, які патрэбен для таго, каб выставіць сьпісак. Вашым-ж баявым „заданьнем" было якраз правесьці ў кожнай вакрузе і гэтым разьбіваць адзіны сял.-работніцкі фронт.

І вы па меры магчымасьці гэта „сумленна" выконвалі. Толькі сьвядомасьць сял.-работніцкіх гушчаў была адпорай вам у гэтым.

Цяпер-ж, каб затуманіць вочы працоўным Беларусі ва „ліпе кракадылевы сьлёзы" аб тым, што ў Польскі Сойм прайшло мала беларускіх прадстаўнікоў!

Дарма!

Сяляне і работнікі ведаюць „ваўкоў у авечай скуры". А.

Аружны напад у Сьвянцяншчыне. Газэты падаюць сэнсацыйную вестку аб аружным нападзе бандытаў у Сьвянцяншчыне. Справа была так. На фальварак Лугі (якіх 13 кілёмэтраў ад Сьвянцян) у 5 гадзін па паўдні напаў атрад бандытаў, лічучы 26 чалавек, азброеных ружжамі і рэвальвэрамі. Пакінуўшы на варце частку сваіх людзей, рэшта напала грабіць фальварак, пасьля чаго ад бандытаў і „сьлед прастыў"—яны прапалі ў нявядомым кірунку.

Паведамленая паліцыя пачала „pościg", а з Вільні ў Сьвянцяны прыехаў заступнік начальніка ваяводзкага сьледчага аддзелу падкамісар Мірэк.

На „Крэсах" ізноў „пачынаецца", толькі няма сумліву, што гэта пачынаецца не бандытызм „antypaństwowych Białorusinów", а гэта „падгатоўка" да прысуду над „Грамадой", да плеч якой прышпіляць яшчэ не адну такую адумына сфабрыкаваную „сэнсацыю".

Апраўданьне Бісьпінга. Вядомы душагуб і падпальшчык Бісьпінг апраўданы ў Апэляцыйным Судзе ў Варшаве за забойства кн. Друцка-Любецкага.

Расейскім Акружным Судом у 1914 г. Бісьпінг быў засуджаны за гэтае забойства на 15 гадоў вастрогу. Апэляцыйны Суд польскі ў 1926 годзе гэты прыгавор зацьвердзіў.

Абарона ўнясла касацыю. Найвышэйшы Суд пастанавіў разглядзець справу ў Апэляцыйным судзе пры новым складзе судзьдзяў. І вось, цяпер гэты новы склад судзьдзяў апраўдаў Бісьпінга.

Ці ня рай тут? Падпальшчык беларускіх вёсак, забойца беларускіх сялян і навет князёў—гуляе на волі.

З Т-ва Бел. Школы.

Спэктакль-вечарына.

15 красавіка г. г. стараньнем драматычнае сэкцыі Беластоцкага гуртка Т-ва Бел. Школы ў мястэчку Супрасьлі, Бел. павету, адбыўся спэктакль. Згулялі: „Мікітаў лапаць" камэдыю ў трох актах Кудзелькі і жарт Чэхава „Мядзьведзь". Хор прапяяў беларускія песьні: „Баба Ксютка", „Ці ня быстрая рэчка", „Сонны сэрцам душой", украінскую — „Дивка в синях стаяла" і гымн — „Не пагаснуць зоркі ў небе".

21 красавіка г. г. гэтай самай сэкцыяй пастаўлены спэктакль у Беластоку. Згулялі: „Выбары старшыні" трагі-камэдыю—у 3 актах з сьпевам і скокамі К. Сваяка.

Чысты даход з гэтых спэктакляў пойдзе на будову народнага дому ў Беластоку.

Сяляне — беларусы, бярэце прыклад з Беласточчан. Чэсьць ім!

Працы Гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

× М-ка Картуз-Бяроза, Пружанскага павету. У нядзелю 15.IV 28 г. у м-ку Картуз-Бяроза ў памешканьні мясцовага тэатру Г-ком Т-ва Бел. Школы быў наладжаны спэктакль-вечарына. Пастаўлена была п'еса Ф. Аляхновіча „Шчасьлівы муж". Ня гледзячы на дрэнную пагоду, глядзельнікаў было шмат і ўсе асталіся задаволены добраю гульнёю артыстаў-аматараў. Збор атрымалі ў суме 129 зл. 50 гр. Чысты даход пайшоў на карысьць бібліятэкі-чытальні, якую на паседжаньні 22.IV 28 г. пастанавілі залажыць.

× Слонімшчына. Драматычнай сэкцыяй Г-ка Т-ва Бел. Школы з в. Яруцічы, дзякуючы таму, што Слонімскі стараста забараніў у сваёй вёсцы паставіць спэктакль, у вёсцы Буле 16.IV 28 г. быў наладжаны спэктакль-вечарына. Сяляне вёскі Булы, радасна прывіталі маладых Яруціцкіх артыстаў. Былі згуляны наступныя п'есы: „Конскі партрэт", „Чорт і баба", „Лекары і лекі" і „Суд". Спэктакль прайшоў вельмі добра. Зьвяртаецца ўвага на кепскія адносіны некаторых маладых хлапцоў з в. Булы да спэктаклю.

Пара, пара, моладзь, ужо прабудзіцца!

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Народныя дамы.

Першым заданьнем працоўных павінна быць — барацьба за эканамічнае вызваленьне т. зн. за зямлю—сялянам і фабрыкі — рабочым; за свае сялянска-работніцкія каапэратывы і г. д.

Гэтая барацьба займае першае месца ў вызваленьні працоўных.

Але працоўныя не павінны даць спуску і на груньце культурным!

Культуры накінутай буржуазіяй — працоўны Беларусі павінен супаставіць сваю — культуру працы і барацьбы!

Шлях, па якім працоўныя Зах. Беларусі ідуць да вызваленьня, кіруецца гэтымі двума фактарамі. Першы—шлях палітычнага характару—праявіўся ў аграмадным узросьце бышай Грамады, другі — шлях культурнага характару—Т-ва Беларускай Школы.

Дакранемся цяпер апошняга.

Гурткі Т-ва, якія густою сеткаю пакрываюць абшар Зах. Беларусі і захапляюць у свае рады сялян і рабочых, павінны стацца асяродкам, вогнішчам культурнай працы і кіраваць культурным рухам працоўных.

Каб стаць на вышыні сваёй мэты, гурткі, апроч сваёй ініцыятывы праяўленай у ладжаньні спэктакляў, рэфэратаў і г. д., павіны захапіць пад свой „загад" увесь вольны ад працы час сваіх сяброў ці не сяброў. Гульні, зборкі, скокі павінны кіравацца заўсёды Гуртком, напамінаючы ўсьцяж аб культурных мэтах і значэньні Т-ва Бел. Школы.

Адзіным спосабам для „захапленьня жыцьця" вёскі ў рукі сьведамых адзінак ёсьць—Народны Дом.

Народны Дом—гэта прасторнае памешканьне, дзе можна склікаць сходы, ставіць спэктаклі, вечарыны, чытаць рэфэраты, ладзіць розныя гульні і г. д.

Народны дом—гэта тое месца, дзе зьбіраецца ўся вёска, ці мястэчка, як старыя так і малыя, хлопцы і дзяўчаты; дзе жыхары вёскі бачаць і адчуваюць сваю супольнасьць, злучнасьць, роўнасьць цяжкага палажэньня іх—працоўных; дзе яны знаходзяць асалоду ў надзеі магчымасьці палепшаньня свайго палажэньня шляхам супольнай барацьбы за свае матар'яльныя і духодыя патрэбы; дзе яны здабываюць тую патрэбную для іх іскру радасьці і ўцехі.

Народны дом — гэта дом як-бы адной дружнай сьм'і!

Яшчэ большае значэньне набірае Нардом у мястэчках, як пунктах, у якія найбольш зьбіраецца людзей з акалічных вёсак. У сьвяточныя дні, ня маючы куды зайсьці, моладзь бязмэтна блытаецца. Каб-жа быў Народны Дом, моладзь знайшла-б тут самае здаровае і карыснае правядзеньне часу: тут яны-б чыталі кніжкі, газэты, ладзілі-б скокі ці гульні, слухалі-б рэфэраты і г. д.

Такім чынам значэньне Народнага Дому ёсьць вялікае і ўсім зразумелае, за гэтым прыпынку быць ня можа, справа толькі ў тым, як залажыць гэткі дом?

Есьць два спосабы: або збудаваць адумысна для гэтае мэты дом, або наняць гатовы.

Збудаваць уласнымі сіламі пры нашых абставінах Народны Дом! Якая-ж думка можа даць большае задавальненьне, калі ня гэтая?

Зьдзейсьненьне-ж гэтае думкі можа стацца толькі пры вельмі вялікіх высілках сьвядомасьці і дружнасьці вёскі. Есьць факты, што дамы будуюцца. У вёсцы Вострава і Чамярох, Слонімскага пав., ужо куплена дрэва, якое ўжо прыгатаўляецца да будовы. Першыя дасталі засобы на будову дому ад сваіх братоў з Амэрыкі, якія адгукнуліся на іх просьбу, другія-ж уласнымі высілкамі (прадалі, сена выробленае супольнымі сіламі). Гэтыя весткі мусім шчыра прывітаць; яны павінны паслужыць прыкладам дружнасьці і сьвядомасьці працоўных вёскі.

Але не ўва ўсіх вёсках ёсьць дружнасьць і сьвядомасьць свайго палажэньня.

У гэткім выпадку трэба застасаваць другі спосаб—наняць памешканьне. Прыкладам гэтага спосабу можа паслужыць Казлавецкі Гурток Т-ва Бел. Школы. Справа Народнага Дому заўсёды абгаварвалася вельмі горача. Нарэшце пастанавілі наняць памешканьне. Але скуль узяць нейкіх там 25 зл. у месяц? Такой, здаецца, простай задачы, а праз доўгі час не маглі разьвязаць! Урэшце дайшлі да розуму і пачалі сьпісваць тых сяброў, якія могуць кожны месяц даць адзін злот. Павялі энэргічную агітацыю, тлумачэньне карысьці ад уласнага памешканьня і ў хуткім часе знайшлася патрэбная колькасьць людзей і памешканьне гатова,—ёсьць ужо Народны Дом!

Чаго больш жадаць!

Гэта павінна паслужыць адным з лепшых прыкладаў!

Такім чынам, пазнаўшы тую аграмадную карысьць Народнага Дому і як яго залажыць, кожны гурток Т-ва мусіць мець яго ў як найхутчэйшым часе.

Маючы-ж гэтую вялікую падпору, вогнішча культурнай працы, хутка лопнуць ланцугі цемры, і працоўны беларус здабудзе свае правы! **Малады Будаўнік.**

Праца нашых радных.

(вёска Лушнева, Баранавіцкага пав.).

Пачуўшы некалькі фактаў аб радных нашае Маўчадзкае воласьці, фактаў вельмі для нас балючых і, чытаючы ў газэтах аб паступовай працы радных з іншых валасьцёў, я ня лічу сябе ў праве абыйсьці моўчкі, ня даць магчымасьці даведацца грамадзянам гэтае гміны, якія аб гэтым ня чулі.

Паводле нейкага закону, быццам пры кожнай польскай школе павінна быць утворана нейкая „канцэлярыя",— з гэтае прычыны абгаварвалася пытаньне аб выасыгнаваньні на гэта грошаў.

Замест таго, каб узяць прыклад з іншых самаўрадаў і адклікнуцца на просьбу дапамагчы вучням-беларусам, якія знаходзяцца ў вельмі цяжкіх матэр'яльных варунках і, ня гледзячы на абсолютную большасьць радных беларусаў, дзякуючы ўгодзе некаторых з іх, было пастаноўлена зацьвярдзіць жаданыя інспэктарам самаўрадаў 1000 зл. на „канцэлярыю" пры школе. У сутнасьці-ж гэткае канцэлярыі ў нашай гміне, здаецца, няма.

Гэтымі ўгадоўцамі ёсьць радныя [вёсак Лушнева, Міцкавіч і інш.

Грамадзяне! Не забывайцеся таго, што гэтым самым вы здраджаеце інтарэсам, ня толькі вашых вёсак, але агулам падстаўляеце нагу тым, якія стаяць на правільным шляху! Пакіньце гэтую супольную з абшарнікамі дарогу і станьце ў рады працоўных людзей, з якіх і вы вышлі і чымі галасамі вы атрымалі прадстаўніцтва ў самаўрадзе!

П. Калантай.

Да працы сябры!

(Доўбневічы, Казлавецкай вол., Слонімск. п.).

Недалёка ад м-ка Казлоўшчыны ляжыць вёска Доўбневічы.

Вёска, як вёска: дзеравяныя хаты, саламяныя стрэхі, балотная вуліца, крацавітыя людзі...

Але адным выдатная гэта вёска: хлапцы і дзяўчаты славяцца на ўсю ваколіцу: стройныя, дужыя, прыгожыя з формы і твару яны заварачваюць галаву ўсім сваім сябром... Не адна дзяўчына выйшла замуж за паліцыянта, ці паштавіка (што лічыцца сярод цёмры вялікім гонарам).

Пытураюць дзяўчатам і хлапцы: шмат з іх падаставалі ніжэйшую адукацыю, умеюць чытаць пабеларуску, парасейску, і папольску.

Выпісваюць радыкальную сял.-раб. газэту, але плаціць за яе ня хочуць.

А дружныя—проста ўсе, як адзін! Трэба, прыкладам, зрабіць вечарынку—зараз усё гатова: і хата, і музыкі, і некалькі... бутэлек водкі...

Прыйшлося і мне ў прошлым годзе пабываць на такой вечарынцы. У хату сабралася цёлая вёска: старыя, малыя, хлопцы і дзяўчаты. І што вы думаеце? Пабачыў я там тэатр, але тэатр цемнаты. Бяз сцэны, па сярэдзіне хаты ставіцца стол, крэслы; навакол людзі з цікавымі вачыма. Праз нейкі час, выходзіць „артыст" з вусамі, барадою і разыгрываюць, досыць удала, але няпрыстойныя анэкдоты; усё гэта пажыраецца цікавымі вачыма глядзельнікаў.

Далей ішла дэклямацыя вершаў. Гэта былі ізноў жа вершаваныя анэкдоты, вельмі распаўсюджаныя сярод цёмнага народу. На апошні пункт праграмы была складка на... гарэлку і п'яныя скокі да раніцы.

Такія вечарыны ладзяцца што год.

Усё добра, але ведаеце, браточкі, пахне... дзіччом!

Па ўсёй працоўнай Беларусі робяцца вечарынкі, але не такія, як у вас. Хлопцы, такія як вы, сыны працы, ад сахі і цэпа, закладаюць гурткі Т-ва Бел. Школы, выпісваюць творы беларускіх драматургаў, п'есы, камэдыі, у якіх, як у люстры, адбіты лепшыя ідэалы, у якіх знаходзіцца дарога для працоўнага люду і ўсё гэта паказваюць у мастацкай гульні несьвядомым яшчэ масам, вядуць іх за сабою.

За вырučаныя грошы купляюць кніжкі, газэты: распашыраюць асьвету.

Дык ці не пара вашыя дзікія вечарынкі перавярнуць на культурныя? Ці ня досыць вам жыць-гніць—пароцца ў цемры? Ці вы ня можаце свае здольнасьці аддаць на распашырэньне асьветы ў роднай мове? Ці не пара вам нарэшце залажыць Гурток Т-ва Бел. Школы?

Глядзеце, Доўбнявічы, на вас глядзяць усе працаўныя сяляне, усе сябры Т-ва Бел. Школы! Яны чакаюць ад вас папраўкі, чакаюць выпаўненьня доўгу працоўнае моладзі!

Дык жыва да працы!

Сялянскі карэспандэнт.

Да Паважаных Падпішчыкаў.

Гэтым даводзім да ведама ўсіх нашых Паважаных грам. Падпішчыкаў, што хто не ўрэгулюе падпісной платы да **1-га чэрвеня** *с. г., таму высылка газэты будзе спынена.*

Бясплатна газэту высылаем толькі вязьням.

Адміністрацыя.

Рэдактар-Выдавец: А. Лагода.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.